УДК 6

# ПАНТЭОН БАГОЎ ЯК ЧАСТКА РЭЛІГІЙНАЙ КУЛЬТУРЫ

**Барадзін Юрый Сігізмундавіч**
Нацыянальная бібліятэка Беларусі (г. Мінск, Беларусь)

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*Паказаць магчымасці паразумення ўзаемасувязі беларускага і скандынаўскага пантэону багоў з старажытна-антычным і агульнаіндаеўрапейскім пантэонам у рэшышчы параўнальнай міфалогіі.*

Пантэон – культ багоў у язычніцкай міфалогіі, які належыць да аднаго ці іншага народу. У міфалогіі раскрываюцца культурныя традыцыі, якіх прытрымлівалюя народы з часоў старажытнасці (да нашай эры) да эпохі ранняга сярэднявечча (іХ–Х стст.), калі беларусы (частка агульнаславянскай сям'і) і скандынавы (вікінгі) захавалі ўласны пантэон дэміўргаў. З часоў старажытнасці і да ранняга сярэднявечча продкі адчувалі ўплыў язычніцкіх багоў на культуру, на жыццё чалавецтва. Першапродкі багоў ствараюць сусвет разам з чалавецтвам і ўсім жывым, і спараджаюць іншых багоў, якія становяцца часткай пантэону [1, с. 15].

Кожнай групе адпавядала асаблівае боства. Напрыклад, вярхоўны бог вікінгаў і Ўсебацька багоў – Одзін суадносіцца з беларускім і славянскім Сварогам, старажытна-грэцкім і рымскім Зеўсам і Юпіцерам, балцкім Дэевасам, кельцкім Дагда [6, с.210], богам Месапатаміі Ану [11, с. 315], і старажытна-егіпецкім Ра, які адначасова бог сонца. Падобна богу Ра, сонцам кіруюць скандынаўскі Фрэйр, грэцкі Апалон і рымскі Феб, балцкі Саўле, кельцкі Белен, кітайскі Янь-Дзі, вавілонскі Мардук, беларускі і агульнаславянскі Дажбог. Беларусы і славяне адчувалі сябе нашчадкамі і ўнукамі Дажбога [5, с. 29]. Бацька Дажбога – Сварог, акрамя таго, што вярхоўны бог беларусаў, таксама каваль і бог агню. У агульнаславянскай міфалогіі Сварог, як старажытна-егіпецкі Асірыс, скандынаўскі Фарсэці, грэцкая Феміда, рымская Ютрыцыя – выконвае функцыі бога правасуддзя. Падобныя функцыі бога каваля як Сварог, выконваюць скандынаўскі Вёлунд, кельцкі Гаібніў, індыйскі Тваштар, грэцкі Гефест, рымскі Вулкан. Падобна агнём кіруюць Гефест і Вулкан [10, с. 223], індыйскі Агні [8, с. 396], балцкі Праўрыма, вавілонскі Нуску, кельцкі Белен, кітайскі Чжужун [9, с. 288] і скандынаўскі Локі, які з'яўляецца і богам зла. Падобна беларускаму і славянскаму Чарнабогу, які шкодзіць людзям на зямлі, ён прыносіць шкоду іншым багам, і спраджае зло (ад Чарнабога каза Сядуня спараджае Вія, які катуе ў пекле душы грэшнікаў, што не патрапілі ў ірый), а волатка ангрбода спараджае ад Локі пачварных змея Ярмуганда і ваўка Фенрыра, і валадарку скандынаўскага пекла – Хель, куды трапляюць вікінгі, што памерлі без мяча ў руцэ, і ніколі не змаглі патрапіць у палац Одзіна – у Вальхаллу. Валадарства Хель атаясамліваецца з славянскім пеклам Вія – Наві, з грэчаскім Аідам, з рымскім

Плутонам. І царства змрочнага Аіда, і валадарства Хель пільнуе велізарны сабака: трохгаловы Цэрбер і чатырохвокі Гарм. Падобна скандынаўскай Хель, падземным замагільным светам кіруюць егіпецкі Анубіс, грэцкі Аід, рымскі Плутон, індыйскі Яма, балцкі Велняс, кельцкі Віл, кітайскі Янь-ван, вавілонскі Намтар. У беларускай міфалогіі няма пекла: душы ўсіх беларусаў ператвараюцца ў птушак, і адлятаюць у Вырай (славянскі «Ирий»), як вікінгі ў Вальхаллу або Сесрумнір, егіпцяне ў поле іалу. У валадарства Зеўса – Алімп не патрапіў ніхто з грэкаў, акрамя яго сына – Геракла (рымскага Геркулеса). Душы ўсіх грэкаў адыходзілі ў царства змрочнага Аіда [12, с. 59]. Будучы Ўсебацькам у скандынаваў, Одзін, таксама, выконвае функцыі бога вайны як яго аднарукі сын – Цюр, старажытна-грэцкі Арэс, рымскі Марс, індыйскі Сканда, кельцкі Эзус, старажытна-егіпецкі Монту і Пярун – заступнік славянскай дружыны. У адрозненне ад іншых багоў вайны Одзін – аднавокі бог [4, с. 70]. У пантэоне беларусаў і славян Пярун кіруе маланкамі і громам [3, с. 7], як скандыўскі Тор (сын Одзіна), грэцкі Зеўс, рымскі Юпіцер [12, с. 220], балцкі – Пяркунас, егіпецкі Сэт, кельцкі Тараніс [6, с. 217], кітайскі Лэй-Гун [9, с. 290], вавілонскі ішкур [11, с. 318], індыйскі індра [8, с. 397]. Акрамя Одзіна, Фрэйя, якая як багіня вайны, атаясамліваецца з старажытна-грэцкай Афінай, рымскай Мінервай [8, с. 222], і як багіня любові, суадносіцца з беларускай Ладай, з грэцкай Афрадытай, з рымскай Венерай, кельцкай Эйнэ, кітайскай Нюйвай [9, с. 291], вавілонскай іштат [11, с. 318] і старажытна-егіпецкай Бастэт, прымае частку паўшых ваяроў у валадарства Сесрумнір, у поле народнае «Фольькванг», якое суадносіцца з старажытна-егіпецкім полем іалу, куды трапляюць душы тых егіпцян, што рабілі дабро. Аднак, душа таго, хто рабіў зло, і каму на судзе Асірыса вынесены прысуд, трапляе ў пашчу пачвары Амат з лапамі ільва, з целам ільва і галавой кракадыла [2, с. 131]. Падобна душы скандынаўскіх злачынцаў і здраднікаў, асуджаных на вечныя пакуты, усю вечнасць катуе змей Нідхёг і калодзежы Хвергельмір. Такім чынам, яшчэ ў свядомасці язычніцкіх продкаў прысутнічала думка аб замагільным свеце (раі альбо пекле), і аб тым, што зло не застанецца непакараным. Акрамя пакарання за зло, у міфалогіі грэкаў, рымлян і скандынаваў, былі багі і багіні помсты: скандынаўскія Валі (які забіў сляпога Хёда і адпомсціў за смерць Бальдра) і Відар (які ў дзень Рагнарок адпомсціць за бацьку – Одзіна, забіўшы ваўка Фенрыра), грэчаскія багіні посты эрыніі (рымскія Фурыі) – Мегера (Фурына) і Нэмэзіда, якія пераследуюць злыдняў.

Бацька Фрэйра і Фрэйі – адзін з багоў-ванаў – Ньёрд (група скандынаўскіх багоў дзялілася на асаў і ванаў), кіраваў адначасова ветрам і морам. Функцыі ветру як Ньёрд выконваюць беларускі і славянскі Стрыбог, грэцкі Барэй, рымскі Аквілон, індыйскі Ваю, балцкі Бангпуціс, кельцкі Тхан-зо, кітайскі Фэй Лянь, вавілонскі Адад, егіпецкі Шу. Так жа, падобна Ньёрду, морам кіруе грэцкі Пасейдон, рымскі Нептун, балцкі Бангпуціс. Жонка Ньёрда – Скадзі, маці Фрэйра і Фрэйі, як багіня палявання, суадносіцца з дачкой Зеўса – Артэмідай, і рымскай Дзіанай. Будучы багіняй зімы, Скадзі атаясамліваецца з іншым скандынаўскім богам зімы – Уллем, беларускім і славянскім Зюзяй. Так жа з богам вясны – Бальдрам, сынам Одзіна, які будзе забіты праз хітрасць Локі і рукамі сляпога Хёда, а потым пасля дня «Рагнарок» уваскрэсне і будзе пасля смерці Одзіна кіраваць новым, адроджаным светам скандынаваў, суадносяцца беларускія бог і багіня – Ярыла і Лёля.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Скандынаўская міфалогія адрозніваецца ад антычных міфалогій і беларускай міфалогіі тым, што ў ёй, акрамя касмагоніі (стварэння свету) прысутнічае эсхаталогія (разбурэнне сусвету), і скандынаўскія багі ў адрозненне ад іншых багоў – смяротныя. Многія з іх, асабліва, у дзень «Рагнарок» загінуць у няронай барацьбе з нячыстай сілай, і цяперашні свет згарыць ў агні ад вогненнага мяча волата Сурта. Але, разам з гэтым настане і адраджэнне новага скандынаўскага свету, якім будзе кіраваць толькі дабро на чале з богам вясны – Бальдрам, і больш ня будзе ў ім месца для барацьбы і супрацьстаяння паміж дабром злом [1, с. 296].

Міфалогія беларусаў і скандынаваў належыць да агульнаіндаеўрапейскай сям'і разам з міфалогіямі грэкаў, рымлян, балтаў і кельтаў. Трэба адзначыць, што язычніцтва славян і вікінгаў маюць дачынне да агульна-язычніцкай спадчыны і рэлігійнай культуры. Што пацвярджаюць супадзенні і суадносіны функцый скандынаўскіх багоў з функцыямі антычных багоў, якія з'явіліся за некалькі стагоддзяў да нашай эры ў больш старажытных народаў і плямёнаў. У кожнай міфалогіі сустракаецца падобны пантэон язычніцкіх багоў, з падобнымі функцыямі кіравання, як у беларускай і скандынаўскай. Таксама, у любой міфалогіі любога народу ёсць непадобны бог на багоў іншых народаў, на прыкладзе бога вясны – Бальдра, альбо бога зімы – Улля, падобныя якім сустракаюцца толькі беларускай і славянскай міфалогіі. Нягледзячы на некаторыя адрозненні скандынаўскай міфалогіі ад іншых міфалогій, можна прыйсці да высновы, што беларуская і скандынаўская міфалогіі, маючы, таксама, уплыў старажытна-грэцкай і іншых антычных міфалогій, з'явіліся не на пустым месцы. Народы Паўночнай, Сярэдняй і Усходняй Еўропы сфарміравалі ўласны пантэон багоў, захаваўшы старажытныя карані, культурныя традыцыі, побыт і норавы продкаў з часоў ранніх міфалогій. Такім чынам, агульнаіндаеўрапейскі пантэон грэкаў і рымлян, індуюцкі пантэон, даоскі пантэон кітайцаў, пантэон егіпцян з афрыканскімі каранямі і пантэон іншых старажытных народаў паўплывалі на міфалагічную свядомасць народаў ранняга сярэднявечча, пакінуўшы сляды рэлігійнай культуры і паўплывалі на духоўную культуру беларусаў і скандынаваў.

## Літаратура


1. Гербер, Х. Мифы Северной Европы / Пер. англ. Г.Г. Петровой. – М.: ЗАО, Центрполиграф, 2008. – 346 с.
2. Египетская мифология: Энциклопедия. М.: Эксмо, 2002. – 592 с.
3. Иванов, В.В. Исследования в области славянских древностей / В.В. Иванов, В.Н. Топоров. – М.: Наука, 1974. – 342 с.
4. Калацэй, В.В. Параўнальнай міфалогія / Вячаслаў Калацэй. – Мінск: Зорны верасень, Паркус плюс, 2009. – 116 с.
5. Фамицын, Ал.С. Божества древних славян. – М.: Академический Проект; Гаудеамус, 2012. – 315 с.
6. Gąssowski, J. Mitologia Celtów / J.Gąssowski. – Warszawa, 1979. – 224 s.
7. Gieysztor, A. Mitologia Słowian / A.Gieysztor. –Warszawa, 1982. – 272 s.
8. Jakimowicz, M. Mitologia indyjska / M.Jakimowicz, A.Jakimowicz. – Warszawa, 1982. – 384 s.
9. J. Kunstler, M. Mitologia chińska / M. J.Kunstler. – Warszawa, 1985. – 304 s.
10. Krawczuk, A. Mitologia starożytnej Italll / A.Krawczuk. – Warszawa, 1982. – 230 s.
11. Łyczkowska, K. Mitologia Mezopotamii / K.Łyczkowska, K.Szarzyńska. – Warszawa, 1986. – 332 s.
12. Pietrzykowski, M. Mitologia Starożytnej Grecji / M.Pietrzykowski. – Warszawa, 1983. – 320 s.




Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова